УДК 72.025

# Дойлідства слонімскага рэгіёна: прыёмы традыцыйнай архітэктурнай арганізацыі ваконных і дзвярных праёмаў

Шэстак Ю. Т.
Беларускі нацыянальны технічны ўніверсітэт

Прыёмы традыцыйнай архітэктурнай арганізацыі ваконных і дзвярных праёмаў Слонімшчыны адрозніваюцца для мураваных і драўляных сакральных будынкаў, дзе вызначаюцца большай разнастайнасцю, і пабудоваў народнага драўлянага дойлідства, дзе назіраюцца лакальныя адметнасці.

У мураванай архітэктуры паводле складнікаў палатна найчасцей сустракаюцца дзверы глухія (касцёл Святога Андрэя Апостала, г. Слонім) і з фрамугай (былы касцёл бернардынцаў, г. Слонім). Запаўненне дзвярных праёмаў паводле матэрыялу магло быць цэльнаметалічным (Слонім, вул. В. Крайняга, д.13). Аднак абсалютная большасць дзвярэй была драўлянаю з металічнымі скабянымі элементамі, радзей драўлянаю і абабітаю жалезам. Найчасцей цалкам з жалеза рабіліся дзверы, якія вялі ў крыпту.

У храмах распаўсюджаныя дзверы з форткай (былы касцёл бернардынцаў, г. Слонім). Вокны паводле матэрыялу рамы і пераплётаў бываюць цалкам драўлянымі (Царква ў Дзятлаве), металічнымі (кляштар бернардынак, г. Слонім), змяшанымі (Вялікая сінагога, г. Слонім). Часта сустракаюцца драўляныя ваканіцы (царква Нараджэння Божай Маці, в. Міжэвічы), вітражныя вокны (касцёл Святой Тройцы ў Зэльве).

У сучасным народным жытле асноўным відам аздаблення сценаў з'яўляецца шалёўка ў спалучэнні з разьбой і колеравым дэкорам, традыцыйна істотную значнасць у вырашэнні фасадаў маюць ваконныя ліштвы. Для заходніх рэгінаў Беларусі ў цэлым характэрны прастакутныя і сандрыкавыя ліштвы; а радзей за ўсё сустракаюцца франтонападобныя. Можна асобна адзначыць буйны модуль сандрыкавых ліштваў, а таксама падваконны дэкор. На поўдні Слонімшчыны ў ваконным аздабленні пачынаюць часцей з'яўляцца архаічныя салярныя і зааморфныя матывы. Верхнія часткі будынкаў у рэгіёне вызначаюцца шматшэрагавымі і шматколернымі наборамі шчытоў франтона, на якіх звычайна размешчаны даволі сціплы ваконны праём, без дадаткова вылучаных ліштваў і нашчыльнікаў.

У выніку можна зазначыць, што традыцыйныя прыёмы запаўнення і аздаблення дзвярных і ваконных праёмаў у мураванай і драўлянай сакральнай архітэктуры слонімскага рэгіёна маюць шмат агульнага з арганізацыяй гэтых элементаў у будынках заходняй часткі Беларусі ў цэлым. У драўляных пабудовах народнай архітэктуры назіраюцца рысы, характэрныя таксама для дойлідства Заходняга Палесся.